ISSN 2524-2369 (Print)
ISSN 2524-2377 (Online)

Паступіў у рэдакцыю 15.11.2024
Received 15.11.2024

https://doi.org/10.29235/2524-2369-2025-70-1-82-83

# АЛЯКСАНДР ІВАНАВІЧ ЛАКОТКА
## (Да 70-годдзя з дня нараджэння)



У студзені 1955 г., у вёсцы Кузьмічы што ў Дзятлаўскім раёне Гродзенскай вобласці, у сям'і настаўнікаў нарадзіўся выдатны беларускі навуковец, даследчык традыцыі айчыннага дойлідства, член Саюза архітэктараў Беларусі, а таксама арыгінальны мастак – Аляксандр Іванавіч Лакотка, юбілей якога мы адзначаем сёлета.

Жыццёвы і творчы лёс юбіляра і тыповы для таленавітага, працавітага чалавека, і неардынарны: хлопец з далёкай правінцыі стаў акадэмікам, праслаўленым не толькі ў рэспубліцы, але і за яе межамі.

А як нараджаецца і сталее талент? Розных фактараў шмат, і іх заўсёды цікава і пазнавальна даследаваць. Тут і прыгожая навакольная прырода, і помнікі гісторыі на роднай зямлі, і уважлівыя настаўнікі, і ўмовы сямейнага выхавання. Сам Аляксандр Іванавіч надзвычай удзячны сваім бацькам, якія ўсяляк падтрымлівалі і развівалі ў ім цікавасць да навукі і мастакоўскі талент.

Яго насычаная працоўная біяграфія пачалася ў 1977 г., пасля заканчэння архітэктурнага факультэта Беларускага палітэхнічнага інстытута, калі ён прыйшоў у эксперыментальную майстэрню № 2 Інстытута БелНДІ Гіпрасельбуд.

У хуткім часе лёс падараваў яму музейную працу ў Беларускім дзяржаўным музеі народнай архітэктуры і побыту, дзе ён працаваў спачатку загадчыкам аддзела, а пасля і намеснікам дырэктара. Пазней яму давялося быць кіраўніком майстэрні і галоўным архітэктарам праектаў Беларускага рэстаўрацыйна-праектнага інстытута. Каштоўны вопыт, набыты ў названых установах, не раз спатрэбіўся яму ў даследчай працы.

1995 год – паваротны ў жыцці А. І. Лакоткі: ён прыходзіць у Нацыянальную акадэмію навук і з таго часу застаецца верны гэтай установе, паспяхова выконваючы тут шматлікія абавязкі. Так, ён працаваў на пасадзе загадчыка аддзела архітэктуры, намесніка дырэктара па навуковай рабоце, дырэктара Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы НАН Беларусі. З 2012 г. узначальвае Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Арганізацыйную працу Аляксандр Іванавіч паспяхова спалучае з навуковымі даследамі. Ён з'яўляецца доктарам гістарычных навук, доктарам архітэктуры, прафесарам, акадэмікам Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Двойчы доктар навук – выпадак унікальны ў беларускім навуковым дыскурсе, тым больш у названых навуковых дысцыплінах. Але, сапраўды, кожнае прыкметнае архітэктурнае збудаванне – адначасова і помнік гісторыі, і з'ява культуры, этап на шляху народа, сведчанне яго сталасці. Таму акадэмік спалучае доследы ў розных сферах, якія сутыкаюцца, узаемадзейнічаюць паміж сабою, якія цяжка раздзяліць, – гісторыі, этналогіі, мастацтвазнаўстве.

А. І. Лакотка распрацаваў метады даследавання і атрыбуцыі помнікаў архітэктуры і горадабудаўніцтва, выявіў агульныя і рэгіянальныя рысы народнай архітэктуры і побыту. Яму належыць стварэнне навуковай канцэпцыі гістарычнага феномена беларускай архітэктуры, які склаўся ў выніку сінтэзу традыцый Усходу і Захаду Еўропы.

Тое, што нашы гарады і вёскі сталі такімі святочнымі, прыгожымі, надзеленымі непаўторнымі нацыянальнымі рысамі, тое, што дойліды-практыкі пачалі, нарэшце, актыўна выкарыстоўваць у будаўніцтве айчынныя традыцыі, – немалая заслуга даследчыка гэтых традыцый – А. І. Лакоткі, які распрацаваў тэарэтычную і метадалагічную базу ўкаранення нацыянальных асаблівасцей у сучасную айчынную архітэктуру.

Пры гэтым у сферы інтарэсаў вучонага не толькі традыцыйная архітэктура Беларусі, але і найноўшыя сусветныя тэндэнцыі, пра што сведчаць кнігі апошніх гадоў: «Архитектура: авангард, абсурд, фантастика», «Архитектура национальная и архитектура фрактальная: к проблеме идентичности в современной архитектуре» і інш.

Сёння Беларусь займае ледзь не першае месца ў Еўропе па развіцці аргаэкасядзіб, заснаваных на айчыннай народнай культуры. І тут варта адзначыць, што Аляксандр Іванавіч быў адным з ініцыятараў заснавання Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту. Музей стаў узорам. А потым А. І. Лакотка стварыў нямала праектаў рэстаўрацыі помнікаў архітэктуры, распрацаваў сістэму комплекснай ацэнкі аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны для турысцка-рэкрэацыйных зон.

Яшчэ трыццаць гадоў таму Беларусь сярод краін-суседзяў лічылася найменш цікавай для турызму, пазбаўленай арыгінальных аб'ектаў для сузірання, а сёння яна выклікае зайздрасць сваімі прыбранымі, дагледжанымі населенымі пунктамі, найпрыгажэйшымі рэгіёнамі, дзе ледзь не ў кожным паселішчы можна сустрэць які-небудзь цікавы гістарычны помнік або сучаснае збудаванне, любоўна ўзведзенае сярод маляўнічых краявідаў, з улікам нацыянальных традыцый.

У многім гэтаму садзейнічалі кнігі акадэміка, каштоўныя не толькі для калег-архітэктараў і гісторыкаў, але зразумелыя і блізкія для многіх чытачоў, якія цікавяцца краязнаўствам, нацыянальнымі традыцыямі і айчынным мастацтвам. Сярод іх «Драўлянае сакральна-манументальнае дойлідства Беларусі», «Маршруты белорусского туризма: историко-культурные ландшафты Беларуси», «История формирования и современный облик белорусского села» і інш.

Аляксандр Іванавіч удзельнічае ў шэрагу дзяржаўных праграм, у тым ліку праграмы «Адраджэнне сяла», «Ахова і развіццё Прыпяцкага Палесся» і рэгіёнаў, пацярпелых ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Ён таксама ўваходзіць у навукова-метадычны Савет па ахове і рэстаўрацыі гісторыка-культурнай спадчыны і Савет па экспертызе Дзяржаўных праграм пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Чалавек з фенаменальнай эрудыцыяй заўсёды прагне падзяліцца сваімі ведамі, падараваць іх людзям. Таму А. І. Лакотка – не толькі даследчык архітэктуры, але і педагог, і прапагандыст навуковых ведаў. Пад яго кіраўніцтвам напісалі і абаранілі дысертацыі восем кандыдатаў, а таксама восем дактароў навук.

З-пад пяра вучонага выйшла больш двухсот навуковых публікацый, больш двух дзясяткаў кніг. На працягу апошніх гадоў Аляксандр Іванавіч кіраваў шэрагам знакавых праектаў. Ён уваходзіць у аўтарскія калектывы многіх шматтомных выданняў, сярод якіх шасцітомная «Архітэктура Беларусі», «Гарады і вёскі Беларусі», «Нарысы культуры Беларусі», «Беларусы», «Турысцкая мазаіка Беларусі». Акадэмік з'яўляецца членам рэдкалегіі часопіса «Весці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Серыя гуманітарных навук», перыядычнага выдання «Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі», а таксама некалькіх замежных спецыялізаваных выданняў. Да таго ж А. І. Лакотка ўвесь час працуе над укладаннем калектыўных манаграфій і зборнікаў, з'яўляецца навуковым рэдактарам шэрагу кніг, якія выходзяць у Цэнтры даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі.

Аляксандр Іванавіч прадстаўляе Беларусь у маштабных міжнародных праектах: Еўрапейскім савеце па культуры, Міжнароднай арганізацыі народнай творчасці ЮНЕСКА. Ён з'яўляецца акадэмікам Міжнароднай славянскай акадэміі па пытаннях культуры, адукацыі і навукі, членам-карэспандэнтам Міжнароднай акадэміі архітэктуры.

Яго плённая праца адзначана шэрагам падзяк і ўзнагарод, у тым ліку прэміяй Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, прэміяй Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне».

Нельга абысці ўвагай і мастацкую творчасць А. І. Лакоткі, бо яна арганічна звязана з яго даследчай працай. Яго акварэлі і графічныя работы надзвычай паэтычныя, але ў той жа час у кожнай з іх лаканічнымі сродкамі выяўлены асноўныя прыкметы стылю таго ці іншага будынка. Пяшчотнасць – слова, якім можна ахарактарызаваць акварэлі Аляксандра Іванавіча. Гэта і тое пачуццё, з якім ставіцца аўтар да аб'ектаў свайго паказу, і неад'емны складнік творчай манеры мастака.

У апошні час мы шмат гаворым пра выхаванне патрыятызму ў несельніцтва рэспублікі, асабліва ў моладзі. Але сапраўдны патрыёт той, для каго ёсць на зямлі нешта сакральнае, і перш за ўсё святыні свайго народа. Менавіта нацыянальнае духоўнае жыццё – тое, за што і дзеля чаго можна і неабходна любіць сваю радзіму. Мастацкая творчасць юбіляра не толькі прасякнута гэтым пачуццём (адчуваннем сакральнасці храмаў і ўтульнасці хат, у адзінстве з пейзажамі), але і дэманструе шырокай публіцы тыя самыя айчынныя святыні, бо каб любіць, неабходна ведаць.

*Калектыў Інстытута мастацтвазнаўства,*
*этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы*
*Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі*